**У. Радаман**

# ЗНАЧЭННЕ КЕЙДАНСКАЙ УНІІ 1655 Г. ДЛЯ ВКЛ

Асноўнай задачай публікацыі з'яўляецца аналіз шэрагу міждзяржаўных пагадненняў, заключаных паміж Швецыяй і прадстаўнікамі рэгіёнаў ВКЛ на чале з віленскім ваяводам і вялікім гетманам ВКЛ Янушам Радзівілам. У аснове нашага даследавання ляжаць працы Г. М. Сагановіча, А. С. Катлярчука, Л. В. Забароўскага, Г. Люлевіча, К. Бабятынскага, Б. М. Флоры і інш. Таксама былі прааналізаваны асноўныя дакументы, пад якімі мы разглядаем пастановы вальнага сойма Рэчы Паспалітай 1655 г., маючыя непасрэднае дачыненне да падрыхтоўкі і заключэння Кейданскай уніі. Апроч таго, намі ўлічаны вынікі даследаванняў прафесара Інстытута гісторыі Польскай акадэміі навук Г. Люлевіча.

Са згаданых крыніц вынікае, што Януша Радзівіла і яго паплечнікаў да перамоў аб заключэнні дзяржаўнага саюза са Швецыяй падштурхнула сукупнасць ваенных, а таксама знешніх і ўнутраных палітычных фактараў, у тым ліку: няздольнасць нешматлікай арміі ВКЛ спыніць нашэсце войскаў Рускага царства ўласнымі сіламі пры адсутнасці адчувальнай фінансавай і ваеннай падтрымкі з боку Польскага каралеўства, якое адклікала дапаможны корпус з тэрыторыі ВКЛ, рух маскоўскіх войскаў на сталіцу дзяржавы Вільню, а таксама парушэнне шведамі мірнай дамовы і іх хуткае наступленне ў кірунку Варшавы. Першым крокам да ўніі былі прысланыя з паслом Радзівілаў Любянецкім шведскія *«Умовы»*. У адказ шляхта ВКЛ 17.08.1655 г. падпісала *«Дэкларацыю»* (па-сутнасці адрэдагаваныя *«Умовы»*), у якіх яна дамагалася зрабіць тое, для чаго і вырашыла ісці на саюз са Швецыяй – выратаваць сваю Айчыну і захаваць незалежнасць. З працягам баявых дзеянняў становішча пагаршалася, і шведы здолелі выключыць з канчатковага пагаднення некаторыя з тых палажэнняў, якія супярэчылі іх інтарэсам, але былі замацаваны ў жнівеньскай *«Дэкларацыі»*.

У акце Кейданскай уніі ад 20 кастрычніка 1655 г. ужо не ішло гаворкі аб хуткім вяртанні зямель ВКЛ, захопленых царскім войскам, замест цалкам раўнапраўных адносін дзвюх дзяржаў, як было ў рэальнай уніі з Польскім каралеўствам 1569 г., ВКЛ у складзе Шведскага каралеўства гарантаваўся статус суб'екта саюзнай дзяржавы (ці, як лічаць некаторыя гісторыкі, статус аўтаноміі). З падпісаннем Кейданскіх пагадненняў стала зразумела, што таму саюзу, на які спадзяваліся падпісанты «*Дэкларацыі*», нічога не наканавана.

Патэнцыйна дзяржаўны саюз ВКЛ са Швецыяй, дамова пра які па розных прычынах так і не была ратыфікавана, мог прывесці да завяршэння ваенных дзеянняў на тэрыторыі нашай Айчыны нашмат гадоў раней, чым гэта адбылося насамрэч, што спыніла б і бясконцы шэраг ахвяраў. Толькі дзеля гэтага, на нашу думку, іншыя дзяржаўныя дзеячы ВКЛ павінны былі таксама зрабіць тое, што зрабіў Януш Радзівіл са сваімі аднадумцамі ў жніўні 1655 г.

Менавіта ў гэтым мы бачым важнае значэнне жнівеньскага пагаднення, якое магло б стаць грунтоўным фактарам для далейшага развіцця ВКЛ.